ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 32 (126) | Субота, 28 кастрычніка 1972 г. | Год выдання 4-ты | Цана 2 кап.

**НЯХАЙ ЖЫВУЦЬ САВЕЦКІЯ ПРАФСАЮЗЫ—ШКОЛА КІРАВАННЯ І ГАСПАДАРАННЯ, ШКОЛА КАМУНІЗМУ!**

(З Заклікаў ЦК КПСС).

## МЯСЦКОМ ТРЫМАЕ СПРАВАЗДАЧУ

25 кастрычніка адбыўся справаздачна-выбарны прафсаюзны сход выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.

Са справаздачным дакладам выступіў старшыня мясцкома дацэнт **Ф. Ф. Ганчэль.**

Справаздачу аб рабоце рэвізійнай камісіі зрабіла **Т. А. Бондарава.**

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел: інжынер па тэхніцы бяспекі **І. Ф. Сяцяеў,** старшыня прафкома **М. Л. Байда,** дацэнт кафедры хіміі **А. І. Браталюбаў,** выкладчык кафедры грамадзянскай абароны **Г. С. Мільчанка,** загадчык гаспадаркі універсітэта **У. К. Бубнаў,** вахцёр інтэрната № 2 **С. І. Сімановіч,** сакратар парткома **У. В. Казлоў,** інструктар абкома прафсаюзаў **В. Ф. Міронаў.**

Сход прызнаў работу мясцкома здавальняючай і абраў новы састаў мясцовага камітэта і рэвізійнай камісіі.

## *З ДАКЛАДА СТАРШЫНІ МЯСЦОВАГА КАМІТЭТА Ф. Ф. ГАНЧЭЛЯ*

Справаздачны перыяд у жыцці нашай краіны праходзіць у абстаноўцы працоўнага і палітычнага ўздыму, выкліканага рашэннямі XXIV з'езда КПСС і XXVII з'езда КПБ, XV з'езда прафсаюзаў СССР і XIII з'езда прафсаюзаў БССР!

Важным этапам у далейшым руху савецкага грамадства па шляху да камунізму з'яўляецца паспяховае выкананне плана другога года дзевятай пяцігодкі, адобрана лістападаўскім (1971) Пленумам ЦК КПСС і зацверджаны III сесіяй Вярхоўнага Савета СССР.

Ленінская партыя цалкам падцвярджае дзейнасць прафсаюзаў, як самай масавай арганізацыі працоўных, клапоціцца аб тым, каб яны маглі паўней і больш паспяхова выканаць сваю ролю школы кіравання, школы гаспадарання, школы камунізму.

Новым праяўленнем вялікіх клопатаў Камуністычнай партыі аб вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі з'яўляюцца пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму паляпшэнню матэрыяльных і жыллёва-бытавых умоў студэнтаў вышэйшых і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў», «Аб завяршэнні пераходу да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі моладзі і далейшым развіцці агульнаадукацыйнай школы», «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў СССР».

Гэтыя пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР з'яўляюцца бацькоўскім праяўленнем клопатаў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада аб забеспячэнні ўсіх галін народнай гаспадаркі краіны высокакваліфікаванымі спецыялістамі, стварэннем і ўмацаваннем вучэбна-матэрыяльнай базы ВНУ ў адпаведнасці з патрабаваннямі навукова-тэхнічнага прагрэсу, паляпшэннем умоў працы, быту, адпачынку студэнтаў і выкладчыкаў.

«Адной з асноўных задач прафсаюзаў, — указаў XXIV з'езд КПСС, — клопаты аб законных інтарэсах рабочых і ўсіх працоўных, клопаты аб паляпшэнні ўмоў іх працы і быту, узмацненне кантролю за захаваннем працоўнага заканадаўства, правілаў і норм аховы працы і тэхнікі бяспекі, клопаты аб лепшай арганізацыі культурнага і здаровага адпачынку працоўных».

У ПАСТАНОВЕ ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва» падкрэслена, што далейшае развіццё сацыялістычнага спаборніцтва за ператварэнне ў жыццё рашэнняў XXIV з'езда КПСС, за дастойную сустрэчу 50-годдзя ўтварэння Саюза ССР, з'яўляецца важнейшай умовай паспяховага ажыццяўлення задач камуністычнага будаўніцтва. Мясцовы камітэт нашага універсітэта быў выбран на агульным справаздачна-выбарным прафсаюзным сходзе супрацоўнікаў універсітэта 21 кастрычніка 1971 года ў складзе 15 чалавек.

У цэлым састаў мясцовага камітэта быў падабраны ўдалы. Асабліва трэба адзначыць вялікую актыўнасць у рабоце тт. Г. С. Еўдакіменка, М. В. Навучыцеля, В. І. Філічавай, В. М. Касцючэнкавай, Н. І. Папковай і іншых.

Пад кіраўніцтвам партыйнай і вышэйстаячых прафсаюзных арганізацый мясцовы камітэт прафсаюза накіроўваў свае імкненні і намаганні на паспяховае выкананне стаячых перад універсітэтам задач па далейшаму ўдасканаленню вучэбна-метадычнай работы, павышэнню якасці ведаў студэнтаў, развіццю навуковых даследаванняў, выхаванню калектыву ў духу камуністычных адносін да працы і савецкага патрыятызму.

Пасяджэнні мясцовага камітэта праходзілі рэгулярна згодна з зацверджаным планам. Усяго за справаздачны перыяд было праведзена 18 пасяджэнняў мясцовага камітэта, дзе заслухоўваліся важнейшыя пытанні дзейнасці універсітэта.

(Заканчэнне на стар. 2)

*Заўтра — Дзень нараджэння камсамола*

## ІНТЭРВ'Ю З КАМСОРГАМ



**На здымку:** камсорг мехмата Аляксандр **Журавель.**

З Сашам Жураўлём я пазнаёмілася ў камітэце камсамола. Ішла захапляючая гутарка пра тое, якім павінен быць сучасны студэнт, спецыяліст заўтрашняга дня. Тэма ўсіх вельмі хвалявала, таму выказванні былі вельмі жывыя і шчырыя. Часам нават узнікала спрэчка, але мы прыходзілі да агульнай думкі. Сярод спрачаючых асабліва выдзяляўся Саша. У ім адразу прыцягвала ўпэўненасць, уменне даказаць сваю праваату і ў той жа час уважлівыя адносіны да іншых, словам якасць, якая так неабходна камсамольскаму важаку.

Пазней мы пазнаёміліся бліжэй і я даведалася, што Саша — камсорг механіка-матэматычнага факультэта, член Чыгуначнага райкома камсамола.

Некаторыя Сашыны выказванні прадстаўляюць цікавасць. Ітак:

**— Твая думка пра студэнта-троечніка:**

— Пра троечнікаў гаварыць цяжка, таму што яны вельмі розныя. Ёсць, напрыклад, троечнікі — грамадскія работнікі, гэта талковыя хлопцы, але яны не заўсёды могуць правільна спалучаць вучобу з грамадскай работай. Як правіла, тройкай сваёй не задаволены. Другая катэгорыя — троечнікаў-няўдачнікаў. Адзін змог сябе паказаць — атрымаў 4, а другі разгубіўся і — 3. І, нарэшце, самая небяспечная група — гэта раўнадушны троечнік, або троечнік-лайдак. Экзамен ідзе здаваць апошнім, атрымае «здавальняюча» і задаволены. А ведаў жа глыбокіх няма. Хіба атрымаецца з такога студэнта добры спецыяліст?

І вось тут першае слова павінна сказаць група, асабліва студэнты-выдатнікі. Трэба стварыць атмасферу нецярпімасці да тройкі, зрабіць так, каб кожны разумеў сваю адказнасць перад тым, чым ён будзе займацца пасля заканчэння універсітэта. Кожны павінен задумацца, наколькі ён ці яна будзе карысным для людзей, якія веды ім дасць.

**— А як жа сам здаў летнюю сесію?**

— На добра і выдатна.

**— Сучасны студэнт — гэта абавязкова грамадскі работнік?**

— Несумненна. Нам, будучым спецыялістам, патрэбны не толькі глыбокія веды, але і ўменне працаваць з людзьмі, быць у калектыве. А ў ВНУ навучыцца гэтаму ёсць магчымасць. І ўпускаць яе нельга.

У нас на факультэце створана агітбрыгада. Часта выступаем перад насельніцтвам з лекцыямі, канцэртамі. Стала традыцыяй правядзенне дзён мехмата. На ўрачыстым вечары падводзім вынікі праведзенай работы, адзначаем лепшыя групы, лепшых камсамольцаў, віншуем першакурснікаў з уступленнем у вялікае брацтва студэнтаў, даем ім наказ добра вучыцца і актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці. У заключэнне — праграма мастацкай самадзейнасці, дзе гучаць творы нашых факультэцкіх аўтараў і КВЗ паміж студэнтамі і выкладчыкамі.

**— Што ты скажаш пра школу «трэці семестр»?**

— Студэнцкія будатрады — гэта цудоўна. Папулярнасць іх вялікая і заслужаная. Гэта ж здорава, моладзь аб'ядноўвае любоў да працы, калі няважна што ты робіш, мяшаеш цэмент, кладзеш сцяну, варыш боршч, а галоўнае, як ты гэта робіш!

**— Цяжка быць камсоргам?**

— Не ведаю. Ці можна гаварыць цяжка або няцяжка. Проста я не ўяўляю сабе жыцця без рабят, без калектыву. Вось толькі часу вольнага зусім мала, некалі хадзіць у кіно, тэатр.

Дзень у Сашы распісаны цалкам, трэба падрыхтавацца да практычных заняткаў, паспець на чарговае пасяджэнне, зайсці ў камітэт камсамола. А ўвечары — заняткі ў маладзёжным тэатры. Такі ён, Саша Журавель — камсамольскі важак.

**Інтэрв'ю правяла Людміла ДЗЕМЯНЦЕЙ, студэнтка 4 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**



**Уладзімір Касабукін (злева) і Аляксандр Сасноў— два прадстаўнікі універсітэцкага камсамола. Добрыя студэнты, актыўныя грамадскія работнікі.**

**Сёлета Уладзімір і Аляксандр узначальвалі студэнцкія будаўнічыя атрады, якія выдатна зарэкамендавалі сябе на аб'ектах меліярацыі Гомельшчыны і на будоўлях заходняга Казахстана.**



# З КЛОПАТАМ АБ БУДУЧЫМ

*Справаздачна-выбарны партыйны сход на мехмаце*

ПАРТЫЙНАЯ арганізацыя механіка - матэматычнага факультэта — адна з самых вялікіх ва універсітэце. Яна здольная вырашаць надзённыя праблемы камуністычнага выхавання студэнтаў, рыхтаваць высокакваліфікаваныя кадры для народнай гаспадаркі.

Справаздачна-выбарны сход, які адбыўся на днях на факультэце, засведчыў, што камуністы, натхнёныя гістарычнымі рашэннямі XXIV з'езда КПСС, ідучы насустрач 50-годдзю СССР, творча вырашалі задачы навучання і выхавання моладзі.

У справаздачным дакладзе сакратар партыйнага бюро Л. Я. Палякоў засяродзіў увагу камуністаў на тым, што зроблена за справаздачны перыяд, што прадстаіць зрабіць у будучым. У прыватнасці шмат увагі было ўдзелена рабоце партыйнага бюро па паляпшэнню вучэбна-метадычнай і навуковай работы. Калі ў пачатку мінулага навучальнага года на факультэце было 2 кафедры, то цяпер іх 4: алгебры і геаметрыі, матэматычнага аналізу, вылічальных машын і праграміравання, механікі. Зараз падрыхтаван праект загаду аб адкрыцці кафедры дыферынцыйных ураўненняў. Варта адзначыць вялікую мэтанакіраваную работу ў гэтым напрамку парткома і рэктарата. Гэта садзейнічала павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў не толькі па матэматыцы, але і па фізіцы, геалогіі, эканоміцы.

Далей Л. Я. Палякоў прыпыніўся на аналізе работы кафедр, адзначыўшы іх плюсы і мінусы, у прыватнасці, у дзяржбюджэтнай навуковай рабоце. Зараз на факультэце склалася два навуковых напрамкі: тэорыя груп і дыферынцыйных ураўненняў. Так, толькі члены кафедры алгебры і геаметрыі па выніках праведзеных даследаванняў апублікавалі 20 навуковых работ. Навуковыя вынікі па даследчай тэме дакладваліся на Усесаюзным калоквіуме па алгебры і на Рэспубліканскай канферэнцыі матэматыкаў.

Партыйнае бюро лічыць, што першачарговай задачай па паляпшэнню работы кафедр з'яўляецца ўкамплектаванне іх кадрамі.

Прыпыніўся Л. Я. Палякоў на аналізе паспяховасці студэнтаў. Тут поспехі відавочныя. Калі ў 1 семестры паспяховасць склала 83,8 працэнта, то ў 2 — 95,2. Гэта вынік мэтанакіраванай работы ўсяго калектыву. Немалаважную ролю ў гэтым адыграла сістэматычная самастойная работа студэнтаў па вывучэнню грамадскіх і спецыяльных дысцыплін. Садзейнічала таму ўвядзенне цвёрдага графіка правядзення кансультацый, калоквіумаў, кантрольных работ.

НАСТУПНАЯ частка даклада была прысвечана палітыка-выхаваўчай рабоце. Партыйная арганізацыя ўдзяляла паўсядзённую ўвагу фарміраванню камуністычнай перакананасці. Актыўна працуюць у гэтым напрамку камуністы Г. С. Мільчанка, Г. П. Машчыцкі, І. Ф. Харламаў, А. Г. Грышачкін, Л. І. Нядзеля. Яны выкарыстоўваюць ўсе формы работы са студэнтамі.

Расказаў Л. Я. Палякоў аб поспехах факультэта ў спорце і самадзейнасці. Так, было праведзена тры вечары самадзейнасці ў маштабе універсітэта, а таксама 10 выязных канцэртаў. Радуе тое, што гэта сапраўды самадзейнасць, якая вызначаецца масавасцю і майстэрствам. Вельмі добра, што ў баку ад гэтай важнай справы не засталіся і выкладчыкі. Яны не толькі дапамагалі арганізаваць канцэрты, вечары, але і самі прымалі актыўны ўдзел. Традыцыйнымі сталі на факультэце «дні мехмата», якія садзейнічаюць выхаванню грамадскай актыўнасці студэнтаў, павышэнню іх адказнасці за вучобу, навуковую работу і інш. Палітыка-выхаваўчая работа будзе яшчэ больш эфектыўнай, калі ёй будуць займацца не толькі дэканат і грамадскія арганізацыі, але і ўсе кафедры.

Асвятліў у сваім дакладзе Л. Я. Палякоў пытанне аб выкарыстанні права кантролю над дзейнасцю адміністрацыі. Партыйны кантроль разумеецца перш за ўсё як аказанне дапамогі кіраўніцтву факультэта ў вырашэнні задач, якія стаяць перад калектывам, а таксама кантроль за вырашэннем гэтых задач у святле патрабаванняў Камуністычнай партыі. Менавіта з гэтых партыйных пазіцый на адкрытым партыйным сходзе абмяркоўвалася пытанне аб кіраўніцтве дэканатам вучэбна-метадычнай работай. А на другім партсходзе было прынята рашэнне аб стварэнні камісіі па кантролю за дзейнасцю адміністрацыі па стварэнню матэрыяльна-тэхнічнай базы факультэта. Члены партыйнага бюро прымалі таксама ўдзел у назначэнні стыпендый, у складанні дакументаў дэканата. Усё гэта садзейнічала правільнаму ўзаемаразуменню партбюро і дэканата. Праўда, былі некаторыя недаразуменні, напрыклад, у адносінах да саставу вучонага савета факультэта.

Прыпыніўся Л. Я. Палякоў на пытаннях арганізацыйна-партыйнай работы, расказаўшы, якім чынам былі размеркаваны нагрузкі паміж членамі партбюро, адзначыў лепшых камуністаў, сканцэнтраваў увагу прысутных на недахопах, якія неабходна выправіць.

У ЗАКЛЮЧЭННЕ свайго даклада Л. Я. Палякоў сказаў:

— Партыйнае бюро факультэта запэўняе партком і рэктарат універсітэта ў тым, што камуністы механіка-матэматычнага факультэта, увесь калектыў прыкладуць усе намаганні для вырашэння пастаўленых задач, асноўнай з якіх з'яўляецца яшчэ больш шырокае разгортванне палітыка-выхаваўчай работы, а таксама мабілізацыя калектыву на дасягненне галоўнай мэты — падрыхтоўку высокакваліфікаваных, адданых партыі і народу спецыялістаў, дастойных называцца прадаўжальнікамі справы У. І. Леніна.

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел: сакратар партыйнага камітэта універсітэта **У. В. Казлоў,** сакратар камсамольскай арганізацыі факультэта **А. Л. Журавель,** дацэнт кафедры алгебры і геаметрыі **С. А. Сафонаў,** старшы выкладчык кафедры фізвыхавання **А. Г. Грышачкін,** загадчык кафедры вылічальных машын і праграміравання **В. Е. Быхаўцаў,** выкладчык кафедры вылічальных машын і праграміравання **В. М. Курлукоў,** старшы выкладчык кафедры **І. М. Палій,** дацэнт кафедры гісторыі КПСС і навуковага камунізму **Г. П. Машчыцкі.**

У прынятай пастанове камуністы намецілі важныя задачы, на якія неабходна звярнуць увагу і дастойна выканаць. На справаздачна-выбарчым сходзе быў абран новы састаў партыйнага бюро, куды ўвайшлі наступныя камуністы: Л. Я. Палякоў, М. А. Ялецкі, У. Ф. Філіпцоў, І. М. Палій, Н. М. Пакаташкіна.

**В. МІКАЛАЕЎ.**

## МАРШРУТ ДРУЖБЫ

Нядаўна студэнты Маскоўскага вышэйшага тэхнічнага вучылішча імя Баумана — удзельнікі веласіпеднага кросу па маршруту Кіеў — Мінск — Масква — былі гасцямі ў студэнтаў нашага універсітэта. 15 веласіпедыстаў — сімвал 15 братніх савецкіх рэспублік — прысвечаюць свой крос 50-годдзю ўтварэння СССР.

Госці і гаспадары сабраліся ў чытальнай зале інтэрната. Усе з цікавасцю праслухалі лекцыю аб міжнародным становішчы, якую прачытаў студэнт МВТУ. Затым адбылася цёплая сяброўская размова. Маскоўскія студэнты расказалі аб сваёй вну, заснаванай ў 1830 годзе і налічваючай сёння 15 тысяч студэнтаў. У ёй навучаліся вядомыя савецкія вучоныя, канструктары. Масквічы з задавальненнем адказалі на нашы пытанні аб вучобе адпачынку і працы.

А затым былі пытанні да нас. Гасцей цікавіла ўсё: наш малады універсітэт, наш прыгожы горад. З вялікай ахвотай расказаў аб гэтым студэнт 2 курса гісторыка-філалагічнага факультэта Вітар Бабраўнічы Так і пасябравалі мы.

Назаўтра мы развіталіся з новымі сябрамі, абмяняліся значкамі. У камітэце камсамола таксама адбылася цёплая сустрэча з баўманцамі.

Наступны прыпынак веласіпедыстаў — Бабруйск, а затым сталіца нашай рэспублікі — Мінск. Шчаслівага шляху, сябры!

**А. ДЗЯМІДАВЕЦ,**
**наш кар.**



**На здымку:** студэнты МВТУ ў камітэце камсамола.

## КОЛАСАЎСКІЯ ЧЫТАННІ

Мнагалюдна было 25 кастрычніка ў актавай зале корпуса № 4. На сцэне ўзвышаецца партрэт вялікага народнага песняра і нашага юбіляра Якуба Коласа. Студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта — прыхільнікі неўміручага таленту паэта — бурнымі апладысментамі прынімаюць адкрыццё загадчыкам кафедры беларускай літаратуры доктарам філалагічных навук М. М. Грынчыкам коласаўскіх чытанняў.

М. М. Грынчык выступіў з уступным словам, у якім коратка знаёміць прысутных з жыццём Якуба Коласа і прадстаўляе гасцей з Мінска. На свята да нас прыехалі навуковыя супрацоўнікі Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР, вядомыя літаратуразнаўцы Віктар Каваленка і Міхась Мушынскі.

Кандыдат філалагічных навук В. А. Каваленка ў сваім выступленні асвяціў пытанні творчага метаду, станоўчага героя, вытокаў і традыцый Якуба Коласа, якія не маглі не зацікавіць студэнта-філолага.

Многа ўказаў нявырашаных праблем у сваім выступленні кандыдат філалагічных навук М. І. Мушынскі, якія могуць паслужыць студэнтам для напісання навуковых работ. У прыватнасці ён сказаў: «Мы не навязваем вам сваіх поглядаў. А толькі хочам падштурхнуць вас на новыя пошукі і спрэчкі па творчасці паэта».

І ў пацвярджэнне гэтых слоў студэнты 3 курса Лідзія Дзенісенка і Аляксандр Дуброўскі зрабілі добрыя заяўкі. Так, Л. Дзенісенка прачытала даклад на тэму «Паэтызацыя роднай прыроды ў «Новай зямлі», які з'яўляецца часткай яе курсавой работы і думаю, што з цягам часу атрымаецца добры дыпломны праект. А. Дуброўскі таксама адкрыў шмат новага і нявысветленага раней ў навуковай літаратуры аб «Казках жыцця».

У заключэнне загадчык беларускай кафедры М. М. Грынчык ад імя студэнтаў і выкладчыкаў гісторыка-філалагічнага факультэта горача дзякаваў гасцей за ўдзел у чытаннях, а студэнты ўручылі ім букеты кветак.

Безумоўна, такія мерапрыемствы прыносяць вялікую карысць перш за ўсё нам, будучым спецыялістам роднай мовы і літаратуры.

Супрацоўнікі бібліятэкі арганізавалі выстаўку, на якой былі прадстаўлены творы Якуба Коласа і крытычныя працы аб ім.

**Алесь ЛОЗКА.**

ПАРАДЫ ПЕРШАКУРСНІКУ

## ЯК ПРАЦАВАЦЬ НАД ПЕРШАКРЫНІЦАМІ

Лепшы спосаб запомніць прачытанае — гэта коратка запісаць на паперы асноўныя думкі і палажэнні аўтара. Запісы могуць быць некалькіх відаў. Часта ўжо сама тэма, характар і пабудова вывучаемага твора падказваюць від запісу, з якіх найбольш распаўсюджаны наступныя: план просты і разгорнуты, тэзісы, выпіскі, канспект, рэферат.

**ПЛАН.** Пытанні, разглядаемыя ў творы, пералічваюцца ў паслядоўным, лагічна абгрунтаваным парадку. Уяўленне аб асноўных пунктах такога плана дае азагалоўліванне кнігі. Часам назвы глаў або раздзелаў можна выкарыстаць у якасці простага плана, а назвы параграфаў — у якасці разгорнутага.

Для складання плана неабходна перш за ўсё ўважліва прачытаць увесь твор, прадумаць яго, стараючыся ўстанавіць, якім планам карыстаўся аўтар пры напісанні асобных глаў і раздзелаў. Затым ужо план запісваецца ў выглядзе кароткіх фармуліровак.

**ТЭЗІСЫ.** Тэзісы істотна адрозніваюцца ад плана. Яны коратка фармуліруюць асноўныя палажэнні кнігі або артыкула і, такім чынам, перадаюць іх змест. Складанне тэзісаў дапамагае глыбей зразумець асноўныя ідэі твора, выдзеліць самае галоўнае. Гэта прывучае коратка і адначасова дакладна фармуліраваць думку, павышае культуру пісьма.

Тэзісы таксама бываюць двух відаў: простыя — тыя, якія не ўключаюць у сябе аргументацыю, доказы і могуць складацца толькі з асноўных палажэнняў, і складаныя, якія тлумачаць фармуліроўкі.

Перш чым прыступіць да складання тэзісаў, неабходна прачытаць увесь твор, калі ён невялікі, або адну главу, калі прачытаць увесь твор адразу цяжка. Пасля, калі ўжо сталі зразумелымі ідэі ўсёй работы або асобных яе частак, яны коратка і паслядоўна выкладваюцца ў выглядзе пунктаў. Кожны пункт мае характар сцвярджэння (па-грэчаску «тэзо» азначае «сцвярджаю»). Класікі марксізму-ленінізму шырока карысталіся тэзісамі ў тых выпадках, калі хацелі асабліва коратка, выпукла і выразна сфармуляваць свае думкі, асноўныя палажэнні. Класічным прыкладам з'яўляюцца вядомыя «Красавіцкія тэзісы» У. І. Леніна, а таксама «Тэзісы ЦК КПСС да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна».

Асобны від запісу ўяўляюць выпіскі. Іх лепш рабіць не ў сшытках, а на асобных лістах і картачках.

**КАНСПЕКТ.** Найбольш дасканалым і распаўсюджаным відам запісу прачытанага з'яўляецца канспект (ад лацінскага «канспектус» — агляд). Канспект уключае ў сябе ўсе іншыя віды запісу. Прычым яго можна дапоўніць матэрыяламі і фактамі, узятымі не з адной, а з многіх крыніц. Канспект некалькіх твораў на адну тэму называецца тэматычным. Ён ужо блізкі да рэферата.

Пры асэнсаваным канспектаванні ў студэнта працуюць зрокавая і маторная памяць. Матэрыял засвойваецца трывала і надоўга.

Хочацца даць некалькі практычных парад. Прыступаючы да складання канспекта, трэба спачатку запісаць прозвішча аўтара, поўную назву твора, год выдання. Калі гэта артыкул, то ўказаць нумар часопіса або зборніка. У тэксце канспекта трэба адзначыць старонкі канспектуемага твора на выпадак, калі неабходна будзе хутка знайсці патрэбныя месцы. На старонках пакідаюцца палі для далейшага папаўнення канспекта.

# РЭФЕРАТ. ЯГО ЯКАСЦЬ?

Кожную восень універсітэт накіроўвае студэнцкія навуковыя работы на рэспубліканскі конкурс. І кожную восень гэта мерапрыемства нагадвае «штурм»: паспешліва дапісваюцца і рэцэнзіруюцца работы, адбываецца іх вонкавае афармленне і г. д. Часта можна чуць дакоры кіраўнікоў і старшынь саветаў СНТ факультэтаў на адсутнасць на кафедрах пішучых машынак, машыністак і г. д.

Нам мяркуецца, што і спешку, якая прыводзіць да зніжэння ўзроўню і якасці афармлення работ, і «адсутнасць» машыністак і пішучых машынак можна ліквідаваць, калі разглядаць работу СНТ не як кампаніі рознага маштаба, а як паўсядзённую планамерную работу і студэнтаў, і выкладчыкаў.

Калі ўважліва праналізаваць апошнія рашэнні партыі і ўрада аб савецкай вышэйшай школе, адразу ж можна бачыць, якая велізарная ўвага ўдзяляецца праблеме выжываемасці ведаў у студэнтаў, пытаням падрыхтоўкі спецыялістаў менавіта вышэйшай, а не проста высокай кваліфікацыі.

А што мы нярэдка маем пакуль у сапраўднасці? У шостым семестры студэнты размяркоўваюцца па спецыялізацыях, але большая іх частка не ведае, як правільна скласці рэферат па таму або іншаму пытанню, як падабраць да яго літаратуру і скласці бібліяграфію, не маюць належнага ўяўлення аб навуковым апараце рэферата, артыкула або справаздачы.

Не выратоўвае становішча і тая акалічнасць, што ўжо з першага курса яны пішуць рэфераты па грамадскіх навуках. Гэтыя рэфераты, як правіла, прадстаўляюць сабой канспект двух-трох артыкулаў або проста набор цытат, напісаны ў спешцы, неахайна — па прынцыпу «абы адчапіўся выкладчык», абы зрабіць гэта заданне хутчэй. Калі прагледзець журналы наведваемасці кабінетаў і чытальнай залы, можна без асаблівых цяжкасцей вызначыць, калі асобныя групы павінны здаваць рэфераты на праверку выкладчыкам — найбольшая наведваемасць назіраецца менавіта за дзень — за два да іх здачы. Адсутнасць жа строгага падыходу да якасці рэфератаў нараджае ў студэнтаў думку аб іх непатрэбнасці, эпізадычнасці.

Аднак мэта рэферата — зацікавіць студэнта ў больш глыбокім, у параўнанні з іншымі, вывучэнні і асэнсаванні асобнага пытання пазнаваемай навукі (менавіта навукі, а не курса або вучэбнага прадмета), навучыць яго элементам навуковага пошуку, прывіць навыкі падбору літаратуры, сістэматызацыі і апрацоўкі сабранага матэрыялу. Калі ж абмежаваць яшчэ і аб'ём рэферата (скажам да 24 старонак), студэнт навучыцца «без вады» дакладна і ясна выкладаць свае думкі.

У сувязі са сказаным прывядзем некалькі штрыхоў з работы кандыдата філасофскіх навук Барыса Сяргеевіча Панова з студэнтамі другіх—трэціх курсаў. Даючы заданні па выкананню рэфератаў, ён старанна разбірае пытанні аб іх сутнасці, спецыфіцы, аб асноўных прынцыпах і этапах работы па збору і апрацоўцы навуковага матэрыялу. Некаторыя найбольш зацікавіўшыеся філасофіяй студэнты атрымліваюць тэмы больш сур'ёзныя (напрыклад, «Аптымальнасць у фізічных сістэмах», «Аб пераходзе фізіка-хімічных уласцівасцей у біялагічныя», «Аб паводзінах элементарных часцінак у зямных умовах», «Прырода хімічнай сувязі», «Інфармацыйныя працэсы ў фізічных сістэмах» і інш.). Цесна звязаныя з прадметамі спецыялізацый, гэтыя рэфераты знаходзяць жывы водгук у студэнтаў, стымулююць работу ў СНТ. Маюцца некаторыя пацвярджэнні перспектыўнасці такога падыходу да рэфератаў: на апошнім рэспубліканскім конкурсе работы студэнтаў Мікалая Ягоранкава, Валянціны Пяшковай, Барыса Голада і іншых, выкананыя пад кіраўніцтвам Б. С. Панова, атрымалі высокую ацэнку журы.

У апошні час шырока абмяркоўваецца праблема сінтэзу навукова-даследчай і вучэбнай работы студэнтаў, аб формах і метадах іх зліцця. На наш погляд, першым крокам у гэтым напрамку ва ўмовах нашага універсітэта можа быць увядзенне па ўсіх асноўных прадметах факультэтаў напісанне студэнтамі рэфератаў на высокім навуковым узроўні. Яшчэ раз напомнім пры гэтым, што студэнт павінен не проста накапіць нейкую суму няхай сучасных, але і ўтылітарных фактаў, а зразумець сэнс, структуру, прызначэнне вывучаемага раздзелу навукі, яго сувязь з іншымі галінамі ведаў.

Заслугоўвае ўвагі і форма справаздачы студэнтаў аб выкананні (заканчэнні) рэферата. Закончаны рэферат абавязкова павінен абараняцца яго аўтарамі на пасяджэнні гуртка, у групе або на студэнцкай навуковай канферэнцыі факультэта з абавязковым яго шырокім абмеркаваннем. Выгода ад абароны вялікая:

па-першае, іншыя члены гуртка, студэнты факультэта расшыраюць свой кругагляд;

па-другое, аўтар работы атрымае магчымасць абмеркаваць атрыманыя ім вынікі ў коле сваіх таварышаў, выкладчыкаў.

Выкладзеная вышэй прапанова можа садзейнічаць масаваму ўцягненню студэнтаў (у тым ліку і малодшых курсаў) у рады СНТ, павышэнню ўзроўню студэнцкіх навуковых даследаванняў, актывізацыі дзейнасці гурткоў і секцый СНТ.

**А. СІНЮК,**
**выкладчык кафедры тэарэтычнай фізікі, кіраўнік СНТ фізічнага факультэта.**



**На здымку: дослед вядуць студэнты-геолагі.**

# І ПЛЮСЫ, І МІНУСЫ

Справаздачна-выбарны сход — надзвычай важны этап у жыцці факультэта, этап, дзе падводзяцца вынікі пройдзенага, называюцца мінусы і плюсы ў рабоце, намячаюцца планы на будучае.

Прайшоў год працы нашага факультэта, год станаўлення калектыву, нараджэння традыцый.

...Выступае наш прафсаюзны важак Тамара Борсук. Яна з'яўляецца своеасаблівым цэнтрам усіх добрых спраў, а вакол — дзейсны авангард прафарганізацыі — бюро: Ларыса Бандарэнка, Васіль Разуванаў, Ніна Міронава, Галіна Дарафейчык, Алег Цімашэнка, Уладзімір Серпікаў... Усе яны аддалі працы свае імкненні, уменне, а таму і на сходзе было аб чым даваць справаздачу.

Зараз эканамічны факультэт займае 2-е месца па паспяховасці. Так, на старэйшых курсах 100-працэнтная паспяховасць, крыху слабей яна на першым курсе. У нас 39 выдатнікаў, з каго трэба браць прыклад.

Добра папрацавала не толькі акадэмсекцыя, але і бытавая, якую ўзначальвалі Васіль Разуванаў і Ніна Міронава. Наша традыцыйная «кармушка» зноў пачала сабіраць «згаладаўшых птушак». Сход да таго ж дружна прымае рашэнне аб конкурсе на лепшы пакой у інтэрнаце.

А вось у тым, што нашы канцэрты заваёўваюць усё большую папулярнасць — безумоўная заслуга культмасавай секцыі і яе адказнай Ларысы Бандарэнка. У нас добрыя спевакі, чытальнікі, танцоры, аркестр. Думаю, што рады ўдзельнікаў папоўняцца за кошт першакурснікаў. 11 лістапада ў нас традыцыйны вечар «Эканаміст-72», дзе і выявяцца новыя таленты.

А колькі ў нас добрых спартсменаў! Аб гэтым сведчыць той факт, што за нашым факультэтам шмат прызавых месц. Праўда, заняткі спортам не сталі яшчэ настолькі масавымі, як бы таго хацелася. Гэта думка прагучала ў выступленнях намесніка дэкана П. П. Саковіча і адказнага за работу спортсекцыі Уладзіміра Серпікава.

Аб справах сваёй групы расказаў прафорг Мікалай Паўлаў. А выступленне дэкана І. П. Трацэўскага было прысвечана вучобе, яе актывізацыі, грамадскаму жыццю на факультэце.

— Выхоўвайце ў сабе культуру! Будзьце дастойнымі высокага звання студэнта! — заклікала парторг Н. В. Волкава. І ўсе мы адчувалі, наколькі гэта важна, адказна і ганарова быць савецкім студэнтам.

...Работа бюро была прызнана здавальняючай. Абран новы састаў. Наперадзе новыя клопаты, радасці, цяжкасці. Давайце ніколі не будзем абыякавымі да ўсяго гэтага.

**Я. АБРАМЕНКА,**
**студэнтка 2 курса эканамічнага факультэта.**

# ДА ЎВАГІ ПАЛІТІНФАРМАТАРАЎ!

Паведамляецца прыкладная тэматыка палітычных інфармацый сярод студэнтаў ў лістападзе 1972 года.

### ПЫТАННІ ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ

Вялікая сіла інтэрнацыяналізму.
Матэрыял публікуе газета «Советская Белоруссия».

Савецкі дэмакратызм (да Дня Канстытуцыі СССР).
Матэрыял публікуе «Политинформатор и агитатор».

Подзвіг земляробаў.
Матэрыял публікуе «Сельская газета».

### ПЫТАННІ КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

Калектыў і асоба.
Матэрыял публікуе часопіс «Политинформатор».

Праца ўпрыгожвае і славіць чалавека.
Матэрыял публікуе газета «Знамя юности».

### ПЫТАННІ МІЖНАРОДНАГА ЖЫЦЦЯ

Прэзідэнта выбірае капітал (да вынікаў выбараў у ЗША).

Новы крок да міру ў Еўропе

Пачуццё салідарнасці (аб падрыхтоўцы да святкавання 50-годдзя СССР за рубяжом).
Матэрыял публікуе газета «Звязда».

**У мінулую нядзелю ў актавай зале універсітэта прайшоў раённы агляд мастацкай самадзейнасці**

**Паспяхова выступілі ў ім студэнты ГДУ.**

**На здымку: спяваюць «Радзімічы».**



Фотаздымкі для гэтага нумару газеты зрабіў **А. Рудчанка.**

**Рэдактар М. ВОІНАЎ.**

АЗ 34114. «Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Фабрыка «Палесдрук» Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР, Гомель вул. Савецкая, 1.
Адрас рэдакцыі: Гомель, вул. Савецкая, 108.
Зак. 5827